ПАДЗЕЯ

# КАРЭЛІЦКІ РАЁН: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ




Нядаўна гісторыкі і аматары краязнаўства атрымалі цудоўны падарунак. У снежні мінулага года адбыліся XV Карэліцкія чытанні, а ўжо ў сакавіку 2025 года ўдзельнікі навукова-практычнай канферэнцыі атрымалі добрую вестку – толькі што ў Мінску выйшаў зборнік “Карэлічы і Карэліцкі раён: гісторыя і сучаснасць”, у які ўвайшлі матэрыялы XIV (2021 г.) і XV (2024 г.) Карэліцкіх чытанняў. Выданне пабачыла свет дзякуючы Інстытуту гісторыі НАН Беларусі, Міжнароднаму дзяржаўнаму экалагічнаму інстытуту імя А. Д. Сахарава Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і Карэліцкаму райвыканкаму.

У зборніку змешчаны вынікі навуковых даследаванняў, прысвечаных гісторыка-культурнай спадчыне Карэліччыны. Увагай даследчыкаў ахоплены ўсе сферы жыцця рэгіёна ад старажытнасці да сучаснасці. Доктар геаграфічных навук, прафесар БДУ Ядвіга Елавічава свой даклад прысвяціла геалагічным даследаванням прыроднай спадчыны Карэліччыны. Кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела спецыяльных гістарычных даследаванняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксандр Доўнар у сваім артыкуле расказаў пра жыццё Карэліччыны другой паловы XVII – першай паловы XVIII стагоддзяў. У цэнтры ўвагі доктара архітэктуры, прафесара Сяргея Сергачова аказаліся майстрыхі карэліцкіх шпалераў сярэдзіны XVIII стагоддзя. Пра беларускі нацыянальны рух у Заходняй Беларусі і актывістаў Жухавіцкай гміны распавёў кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандр Горны. Супрацоўнікі музея “Замкавы комплекс Мір” Вераніка Красоўская і Наталля Кавалевіч закранулі пытанні, звязаныя з жыццёвым лёсам князя Дамініка Радзівіла і Мірскага прычта ў XIX стагоддзі Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуразнаўства НАН Беларусі Ігар Шаладонаў засяродзіў увагу на аповесці Янкі Брыля “Муштук і папка”. Традыцыйныя рамёствы Карэліччыны, развіццё турызма і некаторыя іншыя пытанні таксама

былі ў полі зроку даследчыкаў. У зборніку змешчаны два артыкулы аўтара гэтых радкоў, прысвечаныя гісторыі школы і царквы ў Карэлічах.

У прадмове да выдання рэдкалегія адзначыла: “Матэрыялы зборніка дазваляюць па-новаму паглядзець на гісторыю гэтага ўнікальнага куточка Гродзеншчыны, раскрыць малавядомыя старонкі мінулага, асэнсаваць ролю рэгіёна ў фарміраванні культурнай спадчыны Беларусі. Аўтары імкнуліся не толькі прадставіць факталагічны матэрыял, але і паказаць жывую повязь часоў, пераемнасць пакаленняў і традыцый”.

Выданне адрасавана вучоным, студэнтам, настаўнікам, краязнаўцам і ўсім, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**Святлана КОШУР**
краязнаўца,
член Саюза пісьменнікаў Беларусі

**На фота:** удзельнікі XV Карэліцкіх чытанняў, аўтары публікацый.



XV Карэліцкія чытанні. Выступае Аляксандр Доўнар




Аляксандр Горны

Святлана КошурУдзельнікі




Святлана Кошур



XV Карэліцкія чытанні. Удзельнікі і госці

